**Бондарава, Т.** Курс на развіццё / Т. Бондарава // Настаўніцкая газета. – 2023. – 7 лют. – С. 6.

**КУРС НА РАЗВІЦЦЁ**




**Першая сярод рэгіёнаў па колькасці дыпломаў заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, увайшла ў тройку лепшых па выніках ЦТ: што спрыяе эфектыўнай рабоце адукацыйнай галіны Віцебскай вобласці.**

На базе ВАІРА адбылося выніковае пасяджэнне калегіі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага аблвыканкама. Велізарнае значэнне ў вобласці надаецца выхаванню моладзі на прынцыпах захавання гістарычнай праўды, далучэння да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, пераемнасці пакаленняў, паважлівага стаўлення да дасягненняў продкаў, любові да роднага краю і гордасці за Радзіму. Як паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Дзмітрый Хома, у гэтым кірунку актыўна працуюць 11 рэсурсных цэнтраў па патрыятычным (грамадзянска-патрыятычным) і 14 – па духоўна-маральным выхаванні. Значную работу праводзяць Віцебскае і Полацкае кадэцкія вучылішчы, 22 ваенна-патрыятычныя клубы на базе ўстаноў адукацыі і вайсковых часцей. Клуб «Пошук» Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-тэхналагічнага каледжа з’яўляецца членам Міжнароднай асацыяцыі пошукавых аб’яднанняў «Народная памяць аб абаронцах Айчыны». Рэалізуюцца маштабныя рэгіянальныя ініцыятывы: узорам могуць паслужыць гісторыка-адукацыйны праект «Полацкі рубеж» і грамадзянска-патрыятычная акцыя «Марафон памяці», якая пачалася ў Віцебску, а сёлета набыла статус абласной. Імёны знакамітых землякоў і герояў Вялікай Айчыннай вайны прысвоены 130 установам, у тым ліку 55–у Год гістарычнай памяці. У рабоце з дзецьмі і моладдзю шырока задзейнічаны патэнцыял музеяў, музейных пакояў і куткоў устаноў адукацыі (на цяперашні час каля 260), магчымасці адзінага бясплатнага дня наведвання музеяў, экскурсійная дзейнасць. Толькі за 2022 год памятныя і знакавыя мясціны Беларусі і ў першую чаргу Віцебшчыны наведалі звыш 206 тысяч навучэнцаў, прыкметна развіваецца прамысловы турызм.

Пабачыла свет 2-е выданне абласнога даведніка, якое ўключае больш за 300 тэматычных экскурсійных маршрутаў.

– Сістэма адукацыі – падмурак, на якім стаіць і будзе стаяць наша грамадства. На гэтым падмурку адбываецца фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці не толькі навучэнцаў, але і іх бацькоў. Выхаванне падрастаючага пакалення – задача нумар 1. Моладзі трэба дакладна ўсведамляць, хто мы, адкуль і куды ідзём, – падкрэсліў намеснік старшыні аблвыканкама Вячаслаў Дурноў.

Пэўная станоўчая дынаміка ў сістэме адукацыі назіраецца па пераважнай большасці напрамкаў работы. Выказваючы падзяку педагогам і кіраўнікам, Дзмітрый Хома акцэнтаваў увагу, што Віцебшчына ў мінулым годзе стала першай сярод рэгіёнаў па колькасці дыпломаў, атрыманых навучэнцамі на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, паказала найлепшы вынік на алімпіядзе школьнікаў Саюзнай дзяржавы, увайшла ў тройку лепшых па выніках цэнтралізаванага тэсціравання. Прычым варта дадаць, што амаль палова выпускнікоў 9-х класаў прадоўжыла навучанне ва ўстановах прафесійнай адукацыі. Пытанні дапрофільнага навучання і дапрофільнай падрыхтоўкі – сярод безумоўных прыярытэтаў. Вучэбныя прадметы на павышаным узроўні вывучаюць 84,8 працэнта старшакласнікаў і 32 працэнты навучэнцаў 8–9 класаў; для базавых класаў арганізавана прафесійная падрыхтоўка. Працуюць 96 класаў (груп) педагагічнай і 185 класаў (груп) аграрнай накіраванасці. Дарэчы, за год у 2,7 разы павялічылася колькасць выпускнікоў гэтых класаў, якія паступілі ў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны, ў тым ліку на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі.

Прадстаўнікі школ і гімназій вобласці заваявалі 26 медалёў міжнародных алімпіяд; 130 навучэнцаў прайшлі ўсе этапы адбору і былі залічаны на навучанне ў Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк – адзін з лепшых вынікаў у краіне. Лідзіруючыя пазіцыі ў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах утрымліваюць установы дашкольнай адукацыі. Яскравы ўзор – перамога дзіцячага сада № 32 Полацка на міжнародным конкурсе па робататэхніцы MWRC.Global online 2022: палачане ў фінале прызнаны лепшымі сярод 51 каманды з сямі краін.

На пастаянным кантролі застаюцца пытанні забеспячэння кадрамі, заключэння мэтавых дагавораў, далейшага працаўладкавання выпускнікоў. Цеснае ўзаемадзеянне з заказчыкамі кадраў – асноўная задача для ўстаноў прафесійнай адукацыі. У сувязі з гэтым праведзены рабочыя сустрэчы з кіраўнікамі машынабудаўнічых прадпрыемстваў, лёгкай, абутковай прамысловасці, будаўніцтва. У змест вучэбных праграм, пераліку вучэбна-вытворчых работ, праект кантрольных лічбаў прыёму на 2023 год унесены змяненні і дапаўненні ў залежнасці ад спецыфікі вытворчасці арганізацый – заказчыкаў кадраў. Адпаведна з іх запытамі рэгулюецца падрыхтоўка навучэнцаў. Так, на ўзроўні ССА ў 3 разы запланавана павялічыць падрыхтоўку па спецыяльнасці «Тэхнічная эксплуатацыя тэхналагічнага абсталявання машынабудаўнічай вытворчасці», а на ўзроўні ПТА скарочана падрыхтоўка цырульнікаў, прадаўцоў, кантралёраў-касіраў, рабочых іншых спецыяльнасцей і кваліфікацый, навучанне па якіх можа ажыццяўляцца па праграмах дадатковай адукацыі дарослых. Сучасныя падыходы ў адукацыі садзейнічаюць вырашэнню важных сацыяльна-эканамічных задач. Напрыклад, у перыяд масавых палявых работ у сельскай гаспадарцы вытворчую практыку з сакавіка па кастрычнік праходзяць да 800 чалавек, прычым палова з часовымі або пастаяннымі пасведчаннямі трактарыста-машыніста. Дапамога навучэнцаў на падвозцы кармоў і іншых відах работ дазваляе вопытным механізатарам засяродзіцца на асноўных работах.

Начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі праінфармаваў, што на 2023 год запланавана фінансаванне падрыхтоўкі ўстаноў адукацыі Шаркаўшчынскага раёна да правядзення абласнога фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі–2023» і Гарадоцкага раёна – у рамках святкавання Дня беларускага пісьменства. Летась рамонтна-будаўнічыя работы выкананы ў 23 установах адукацыі на суму 17,5 млн рублёў. Асобныя словы падзякі Дзмітрый Леанідавіч адрасаваў Бешанковіцкаму райвыканкаму за прыцягненне значных спонсарскіх сродкаў і выкананне рамонтных работ у сярэдняй школе № 1 Бешанковіч імя І. І. Строчкі. Важны складнік ва ўмацаванні матэрыяльнай базы – пазабюджэтная дзейнасць. Толькі за мінулы год установы адукацыі вобласці зарабілі больш за 21,1 млн. рублёў, доля пазабюджэтных сродкаў у бюджэтным фінансаванні складае 3,2 працэнта. Праектам бюджэту на 2023 год па галіне «Адукацыя» прадугледжана 977,5 млн рублёў, у першачарговым парадку і ў поўным аб’ёме забяспечаны выдаткі на сацыяльна значныя артыкулы. У лістападзе – снежні былі адкрыты новыя дзіцячыя дамы сямейнага тыпу ў Гарадку і Лёзне, на чарзе – Полацк і Бешанковічы. Працягваецца рэканструкцыя Полацкага кадэцкага вучылішча, будаўніцтва дзіцячых дашкольных устаноў у Віцебску, Полацку і Мёрах. У перспектыве новыя дзіцячыя сады з’явяцца ў Наваполацку, Лепелі і Оршы.

– Сістэма адукацыі Віцебскай вобласці нацэлена працаваць на развіццё, – абазначыў агульны курс Дзмітрый Хома. – Таму ад кожнага з нас патрабуецца пастаянны аналіз сітуацыі і ацэнкі дынамікі па ўсіх напрамках дзейнасці і па кожным паказчыку, а якасць вырашэння пастаўленых задач у новым годзе залежыць ад нашага з вамі ўзаемадзеяння, умення планаваць і расстаўляць прыярытэты, працаваць з людзьмі.

***Ганаровымі граматамі аблвыканкама адзначаны поспехі і дасягненні калектываў Віцебскага дзяржаўнага тэхнічнага і Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльнага каледжаў, упраўлення па адукацыі Полацкага райвыканкама, гімназіі № 2 Віцебска, Асінторфскай сярэдняй школы Дубровенскага раёна, дзіцячага сада № 1 Сянна, Дабрамыслінскага дзіцячага сада «Ялінка». Дырэктару Віцебскага абласнога цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Марынэ Фёдаравай уручана грамата абласнога Савета дэпутатаў. Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджаны галоўныя спецыялісты аддзела па адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Віцебска Алена Піталенка і ўпраўлення па адукацыі Полацкага райвыканкама Анжэла Валасевіч; граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь – намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Акцябрскай сярэдняй школы імя Героя Савецкага Саюза І. П. Собалева Алеся Кучынская, намеснік начальніка аддзела па адукацыі Лёзненскага райвыканкама Алена Круцікава і галоўны спецыяліст аддзела па адукацыі Першамайскага раёна Віцебска Таццяна Карпанава. Многім лепшым педагогам уручаны ганаровыя граматы галоўнага ўпраўлення па адукацыі аблвыканкама.***

**Таццяна БОНДАРАВА.**

**Фота аўтара.**